This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2022.pp.9-30

Przegląd Środkowo-Wschodni, 7, 2022
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20220701

Data przesłania: 04.07.2022
Data akceptacji: 24.07.2022

Andrei Macuk (Andrei Matsuk)
Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk
andrei.macuk@gmail.com
ORCID: 0000-0001-5684-5721

Браслаўскія соймікі ў 1750–1752 гг.[1]

Sejmik brasławski w latach 1750–1752

Artykuł poświęcono działalności sejmiku brasławskiego w latach 1750–1752. Autor na podstawie korespondencji ustalił szczegóły pracy sejmików brasławskich, działalność podczas nich różnych rodów szlacheckich i ugrupowań magnackich. Wybrani posłowie należeli do czołowych miejscowych rodów szlacheckich: Łopacińskich, Kopciów, Wawrzeckich, Mirskich, Strutyńskich, Bielikowiczów. Pod tym względem sejmik brasławski odróżniał się od innych sejmików Litwy, ponieważ w jego skład nie wchodzili przedstawiciele wpływowego ugrupowania magnackiego „Familia", które dominowało na terenie całego Księstwa. Przeciwnie, tu widzimy, że większe wpływy mieli oponenci „Familii" zrzeszeni w stronnictwie Radziwiłłów. Lata 1750–1752 to czas wzrostu liczby zerwanych sejmików brasławskich. Wynikało to z zaostrzenia walk wewnętrznych wśród miejscowej szlachty. W późniejszym czasie to doprowadziło do silnych konfliktów na sejmikach brasławskich i zerwania większości sejmików.

Słowa kluczowe: powiatowy sejmik, Brasław, szlachta, magnaci

Перыяд 1750–1752 гг. гэта даволі спакойны час у гісторыі ВКЛ. У Княстве, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, дамінавала магнацкая групоўка "Фамілія"[2]. У 1750 г. вялікі гетман ВКЛ і віленскі вая-

[1] Артыкул напісаны ў межах рэалізацыі гранту NPRH „Akta sejmikowe województwa połockiego (XVI–XVIII wiek)", NPRH nr 0318/NPRH9/H11/88/2022.

[2] Групоўка родаў Чартарыйскіх і іх бліжэйшых родзічаў Панятоўскіх. У ВКЛ у 1748 г. пасля шлюбу Міхала Антонія Сапегі і Аляксандры з Чартарыйскіх да гэтай групоўкі далучыўся магнацкі род Сапегаў.

вода Міхал Казімір Радзівіл імкнуўся зрабіць маршалкам Трыбунала ВКЛ аднаго з сваіх сыноў Януша ці Караля Станіслава. Аднак, гэта сустрэла моцнае супраціўленне з боку лідара "Фамілii" падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Падканцлер ВКЛ тлумачыў, што такія маладыя і недасведчаныя Радзівілы не здолеюць добра выконваць функцыі трыбунальскага маршалка. Пад яго націскам Міхал Казімір Радзівіл пагадзіўся, каб яго сыны былі звычайнымі суддзямі ў трыбунальскім коле, а маршалкам Трыбунала ВКЛ будзе іх родзіч Альбрыхт Радзівіл. Яго ж сыны мелі атрымаць неабходны досьвед працы ў Трыбунале ВКЛ. У сваю чаргу прыхільнікі "Фамілii" мелі атрымаць урады маршалка Скарбовага Трыбунала ВКЛ і пісара рускай кадэнцыі. У выніку ўсё скончылася як і было дамоўлена. Радзівілы не маглі парушыць такую дамову, бо грамнічныя соймікі скончыліся поўнай перавагай "Фамілii"[3]. Безумоўна, што Радзівілы не былі задаволены такім Трыбуналам ВКЛ, дзе былі вымушаны фактычна падпарадкавацца пазіцыі Міхала Чартарыйскага, хоць і атрымалі вышэйшы трыбунальскі ўрад – маршалка. Хутчэй гэты Трыбунал ВКЛ 1750 г. чарговы раз паказаў, што дамініруе ў ВКЛ "Фамілія". Гэта было пацверджана ў наступныя гады. Выбары ў Трыбуналы ВКЛ 1751 і 1752 гг. таксама скончыліся згодна планам Чартарыйскіх і трыбунальскімі маршалкамі станавіліся іх прыхільнікі – віцебскі кашталян Юзаф Салагуб і мечнік ВКЛ Шымон Сіруць[4]. Аднак, менавіта ў гэты час дарогі Чартарый-

[3] Z. Zielińska, *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983, s. 321–323. А. Мацук, *Пінскі соймік у трыбунальскай кампаніі 1750 г.* [у:] *Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі "Гісторыя і сучаснасць Пінска (да 910-годдзя першай летапіснай узгадкі горада)"*, Мінск–Пінск 2007, с. 77–93. А. Мацук, *Палітычная сітуацыя вакол Трыбунала ВКЛ 1750 г.* [у:] *Приложение к журналу «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Молодёжь в науке*, 2008, часть 2, с. 218–222.

[4] *Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis*, pod red. A. Rachuby; oprac.: A. Rachuba i P. P. Romaniuk, przy współpr. A. Macuka i J. Aniszczenki, Warszawa 2004, s. 228–234. Z. Zielińska, *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983, s. 334–335.

скіх і каралеўскага двара пачынаюць разыходзіцца і яны перастаюць быць прыдворнай групоўкай. Праўда, "Фамілii" яшчэ атрымліваецца ўзмацніць свае пазіцыі, калі пасля смерці (6 ліпеня 1751 г.) Яна Фрэдэрыка Сапегі ўрад канцлера ВКЛ на сойме 1752 г. атрымлівае Міхал Чартарыйскі, а ўрад падканцлера ВКЛ па ім атрымаў яго зяць Міхал Антоній Сапега. Да апошняга супрацьстаяла гэтаму новая прыдворная групоўка кароннага надворнага маршалка Юрыя Мнішака і іх саюзнікі ў ВКЛ Радзівілы, які прапанавалі да ўрада падканцлера ВКЛ мсціслаўскага ваяводу Ігната Сапегу[5].

Браслаўскі павет быў адным з пяці паветаў, што фармавалі Віленскае ваяводства. У панаванне Аўгуста III мясцовы соймік адбываўся ў павятовай сталіцы Браславе на замку[6]. Соймікі Браслаўскага павета ўжо знаходзіліся ў цэнтры нашай увагі. Як атрымалася нам ўстанавіць, то для правядзення браслаўскіх соймікаў на замку была пабудавана спецыяльная соймікавая ізба[7]. У той жа час па-за нашай увагай засталіся браслаўскія соймікі ў 1750–1752 гг. Прычынай гэтаму была малая лічба крыніц пра соймікі 1750–1752 гг. Гэта выклікана тым, што ў асноўным соймікавыя дакументы актыкоўваліся ў мясцовым гродскім судзе, але акты браслаўскага гродскага суда згарэлі яшчэ ў 1812 г.[8] У такой сітуацыі мы былі вымушаны асноўную інфармацыю пра браслаўскія соймікі шукаць у карэспандэнцыі. У асноўным гэта карэспандэнцыя, якая захавалася ў матары-

[5] Z. Zielińska, *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983, s. 327–341. M. Czeppe, *Kamaryla pana z Dukli. Kształtowanie się obozu politycznego Jerzego Augusta Mniszcha 1750–1763*, Warszawa 1998, s. 38–40, 106–108. А. Мацук, *Барацьба магнацкіх груповак за ўрад падканцлера ВКЛ у 1752 г.*, „Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук", 2010, №1, с. 57–64.

[6] A. Rachuba, *Miejsca obrad sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1569-1794* [у:] *Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддях*, Мінск 2008, с. 186.

[7] А. Мацук, *Браслаўскія соймікі ў 50-х–пачатку 60-х гг. XVIII ст.*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2015, № 44, s. 62–98. А. Мацук, *Браслаўскія соймікі ў другой палове 30–40 гг. XVIII ст.*, „Архіварыус", выпуск 16, 2018, с. 226–239.

[8] O. Hedemann, *Historia powiatu brasławskiego*, Wilno 1930, s. 233.

ялах рода Лапацінскіх. Гэты род вядомы як прыхільнікі магнацкага рода Сапегаў[9]. Яны ў гэты час якраз умацавалі свае пазіцыі сярод шляхты ВКЛ. У тым ліку гэта тычылася і Браслаўскага павета, дзе мясцовым соймікам цікавіліся ўсе тры браты Лапацінскія: Ян Дамінік, Мікалай Тадэвуш і Ігнат Блажэй. Апошні з іх асноўную сваю дзейнасць звязаў з Браслаўскім паветам і ў 1752 г. нават стаў браслаўскім гродскім суддзёй[10]. Карэспандэнцыя гэтага рода знаходзіцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве (фонд 1135, вопіс 14) і бібліятэцы Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук (фонд 119). У гэтай карэспандэнцыі ў асноўным прадстаўлены планы і іх рэалізацыя на браслаўскім соймiку магнацкай групоўкі "Фамілii". Магнацкая групоўка Радзівілаў таксама шмат увагі надавала браслаўскаму соймiку. Карэспандэнцыя аб браслаўскім соймiку была знойдзена ў лістах шляхты да Радзівілаў з 5 раздзелу Архіва Радзівілаў у Галоўным архіве старажытных актаў, а таксама ў копіях лістоў вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводы Міхала Казіміра Радзівіла, што знаходзяцца ў 4 раздзеле гэтага ж Архіва Радзівілаў Галоўнага архіва старажытных актаў. Менавіта гэтая карэспандэнцыя Лапацінскіх і Радзівілаў стала асновай для нашага артыкула, якая была дапоўнена іншымі рукапіснымі матарыяламі. Мэтай нашага артыкула з'яўляецца даследаванне функцыянавання браслаўскага соймiка ў 1750–1752 гг.

Да пачатку 50-х гг. сярод браслаўскай шляхты значна ўзмацніліся пазіцыі рода Ваўжэцкіх, якія былі звязаны з Радзівіламі. Значная частка групоўкі Радзівілаў у Браслаўскім павеце ў гэты час складалася з вайскоўцаў: Язафат Копаць, Крыштаф Плятэр, Скажэўскі і інш. Таксама значна ўзмацніў свае пазіцыі сярод мяс-

[9] A. Macuk, *Stronnictwo sapieżyńskie w powiatach Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Augusta III* [w:] *Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, Warszawa 2014, s. 307–309.

[10] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. 1. Województwo wileńskie XIV–XVIII wiek*, opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy współpracy U. Jemialianczyka i A. Macuka. Warszawa 2004, s. 575.

цовай шляхты і шакінаўскі староста Юзаф Струтыньскі. Пры дапамозе Сапегаў значна ўзраслі ўплывы сярод браслаўскай шляхты роду Лапацінскіх. Менавіта гэты род галоўным чынам і прадстаўляў інтарэсы "Фамілii" у Браслаўскім павеце. Выйшэйшы на той момант павятовы земскі ўрад (браслаўскага падкаморыя) займаў Антоній Рудаміна. Галоўным яго ўладаннем былі Дукшты. Найбольш актыўным ён быў у 30-я гг. XVIII ст., калі ў 1733 г. быў паслом у Расію, а ў 1736–1738 гг. маршалкам Правінцыйнай[11] камісіі ВКЛ у Гродна[12]. Яго актыўнасць і ўплывы ў гэты час змяньшаюцца з-за сталага ўзросту. Сын Мікалай яшчэ не карыстаўся моцнай падтрымкай сярод мясцовай шляхты. Не праявіў яшчэ сябе вядомы ў пазнейшыя часы Ян Цеханавецкі, які трымаў значнае староства ў Браслаўскім павеце – опскае. Ён вярнуўся з Францыі ў Рэч Паспалітую ў 1750 г., але яшчэ ў гэты час праяўляў слабую актыўнасць ва ўдзеле ў браслаўскіх соймiках[13]. Іншым значным браслаўскім гродскім старостам у Браслаўскім павеце з канца 1738 г. быў Ян Гільзен, які ў гэты час праяўляў слабую зацікаўленасць ва ўдзеле ў браслаўскім сойміку.

Адным з лідараў мясцовай групоўкі Радзівілаў з'яўляўся Язафат Копец, як і ў папярэднім 1749 г., і ў 1750 г. быў канкурэнтам на выбарах дэпутатам на грамнічным сойміку ў Браславе. Ужо ў кастрычніку 1749 г. Ігнат Агінскі інфарміраваў Міхала Казіміра Радзівіла, што Копаць будзе старацца аб выбар дэпутатам на браслаўскім грамнічным сойміку 1750 г., калі да яго звернецца з адпаведнай просьбай вялікі гетман ВКЛ. Таму Агінскі прасіў Радзівіла даслаць адпаведны ліст Копцю праз браслаўскага войскага

[11] Правінцыйная камісія ВКЛ мела заняцца люстрацыяй старостваў з мэтай вызначэння шляхоў і памераў павялічэння войска ВКЛ.

[12] H. Palkij, *Rudomina Dusiacki Antoni Ludwik* [w:] Polski Słownik Biograficzny, t. XXXII, Wrocław–Warszawa–Kraków 1991, s. 669.

[13] *Dzieje rodziny Ciechanowieckich herbu Dąbrowa (XIV–XXI wiek)*, red. A. Rachuba, Warszawa 2013, s. 213.

Феліцыяна Ваўжэцкага[14]. У выніку 17 студзеня 1750 г. Радзівіл напісаў Копцю, каб той стараўся аб выбар дэпутатам на браслаўскім грамнічным сойміку[15]. Таксама Радзівіл быў не супраць, каб дэпутатам у Браславе быў абраны іншы яго прыхільнік Скажэўскі[16]. Ужо ў канцы студзеня 1750 г. Копаць быў перакананы, што будзе абраны дэпутатам у Браславе. У адваротным выпадку верагодна было, што без выбару Копця дэпутатам браслаўскі грамнічны соймік будзе сарваны. Тым больш, што падтрымку Копцю ў выбары браслаўскім дэпутатам абяцалі ўплывовыя шляхцічы Лапацінскія[17].

Яшчэ адзін канкурэнт на выбар дэпутатам у Браславе Цыпрыян Мірскі атрымаў падтрымку ад лідара "Фамілii" падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага[18]. Аднак, нечакана ў апошні момант перад соймікам кандыдатам "Фамілii" на выбар дэпутатам у Браславе становіцца не Цыпрыян Мірскі, а Мікалай Тадэвуш Лапацінскі. На гэтым настаяў падканцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі, бо хацеў бачыць яго сярод суддзяў у Трыбунале ВКЛ, дзе Радзівілы мелі перавагу. Пры гэтым сам Лапацінскі замест дэпутацтва хацеў у 1750 г. быць абраным паслом на сойм[19]. Аднак Лапацінскі быў вымушаны саступіць настойлівасці лідара Фамілii, хоць бачыў значныя перашкоды для свайго выбара браслаўскім дэпутатам і ўвогуле для паспяховага сканчэння мясцовага грамнічнага сойміка. Гэта пры тым, што дапамогу ў выбары дэпутатам у Браславе яму абяцаў мясцовы лідар Агінскіх браслаўскі гродскі пісар Стэфан Беліковіч[20]. Было

[14] AGAD, AR, dz.V, sygn. 10702, cz.2, I. Ogiński do M.K. Radziwiłła, 07.10.1749, Iwie, k. 32.

[15] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 872, k. 87.

[16] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 872, k. 144.

[17] AGAD, AR, dz.V, sygn. 10702, cz. 2, I. Ogiński do M.K. Radziwiłła, 21.01.1750, Mińsk, k. 46–47.

[18] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 25.01.1750, Brześć, p. 8.

[19] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 2, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 30.01.1750, Wilno, l. 227.

[20] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 17.02.1750, Wołczyn, p. 9.

вядома, што шакінаўскі староста Струтыньскі меў занесці пратэстацыю супраць выбара ў Браславе дэпутатам Лапацінскага. Сам ён быў прыхільны Лапацінскаму, але меркаваў занесці пратэстацыю для ўласных інтарэсаў, а дакладней іх большай падтрымкі з боку Міхала Антонія Сапегі. У такіх абставінах Ян Дамінік Лапацінскі раіў брату пераканаць Струтыньскага адмовіцца ад пратэстацыі, паколькі Сапегі і так будуць рупіцца ў яго інтарэсах[21].

У выніку пад дырэкцыяй браслаўскага мечнага Юрыя Квінты дэпутатамі былі абраны мсціслаўскі войскі Мікалай Тадэвуш Лапацінскі і абальніцкі староста і пяцігорскі харужы Язафат Копец. Крэдэнс дэпутатам акрамя дырэктара сойміка падпісалі браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна, браслаўскі стольнік Антоній Ваўжэцкі, браслаўскі гараднічы Антоній Мірскі, аршанскі падстароста Аляксандр Ваўжэцкі, Адам Станкевіч і Ян Станіслаў Мірскі[22]. Праўда, Мікалай Тадэвуш Лапацінскі быў вымушаны абяцаць некаторым браслаўскім шляхцічам дапамогу ў розных справах не толькі ад сябе, але і ад сваіх магнацкіх пратэктараў Сапегаў, каб пазбегнуць іх пратэстацый[23]. Вялікую задаволенасць у выбары браслаўскім дэпутатам Мікалая Тадэвуша Лапацінскага выказваў падканцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі і абяцаў яму падтрымку да ўрада пісара рускай кадэнцыі ці маршалка Скарбовага Трыбунала ВКЛ[24]. Другі браслаўскі дэпутат Язафат Копец быў задаволены са свайго выбара дэпутатам і дзякаваў Міхалу Казіміру Радзівілу за падтрымку, але адначасова прасіў яго пратэкцыі да ўраду пісара рускай кадэнцыі[25]. Праўда, Юзаф Струтыньскі распаўсюдзіў звесткі, як выдавалася непраўдзівыя, што другі браслаўскі дэпутат пяцігор-

[21] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 14, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, b.d., b.m., l. 34.

[22] LMAB, f. 119, b. 9, p. 1.

[23] Львівська наукова бібліотека ім. В. Стефаника НАН України, ф. 103, д. 4995, M. Łopaciński do A. Sapiehy, 14.02.1750, Leonpol, л. 1–2.

[24] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 21.02.1750, Wołczyn, p. 10.

[25] AGAD, AR, dz. V, sygn. 7176, I. Kopiec do M.K. Radziwiłła, 13.02.1750, Brasław, k. 2–3.

скі харужы і абольскі староста Язафат Копец стараецца аб трыбунальскае падскарбства, а калі не атрымае яго, то падасць скрытую пратэстацыю супраць свайго сойміка[26]. Сам Копец у віленскага каад'ютара папрасіў нават пратэкцыі да пісарства рускай кадэнцыі. Аднак атрымаў катэгарычную адмову. Не выключалася, што ў такім выпадку Копец з дапамогай свайго прыяцеля Струтыньскага можа прыдумаць якія перашкоды для браслаўскіх дэпутатаў[27]. Як бачым, браслаўскі грамнічны соймік скончыўся пэўным кампрамісам і былі абраны прыхільнік "Фамілії" Лапацінскі і прыхільнік Радзівілаў Копаць.

У тым жа 1750 г. у Браславе адбыўся і пасольскі соймік. Язафат Копец па загаду Міхала Казіміра Радзівіла накіраваўся ў Браслаўскі павет сачыць за выбарамі на гэтым сойміку. Копаць прасіў больш канкрэтных загадаў Радзівіла аб кандыдатурах будучых паслоў, бо было шэсць канкурэнтаў: 1. шакінаўскі староста Юзаф Струтыньскі, 2. браслаўскі падкаморыч Мікалай Рудаміна, 3. аршанскі падстароста Аляксандр Ваўжэцкі альбо яго бацька Антоній, 4. браслаўскі гродскі пісар Стэфан Беліковіч, 5. Мірскі (невядома дакладна хто з гэтага рода), 6. браслаўскі войскі Феліцыян Ваўжэцкі. Пры чым Радзівіл падтрымліваў выбар паслом Струтыньскага, а таксама прапанаваў кандыдатуру браслаўскага войскага Феліцыяна Ваўжэцкага. Копаць пытаў, як мае паступіць, калі не адмовяцца ад сваёй канкурэнцыі аб выбары паслом браслаўскі падкаморыч Рудаміна, аршанскі падстароста Аляксандр Ваўжэцкі, а на браслаўскага войскага Ваўжэцкага не згодзіцца мясцовая шляхта, бо абедзьве групоўкі не дазволяць на яго выбар[28]. Асабліва актыўна стараўся аб выбар паслом Аляксандр Ваўжэцкі, які збіраўся не дапусціць да

[26] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 2, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 27.02.1750, Wilno, l. 242v.

[27] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 2, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 13.03.1750, Wilno, l. 245v.

[28] AGAD, AR, dz. V, sygn. 7176, I. Kopiec do M.K. Radziwiłła, 13.06.1750, Wilno, k. 5–6.

выбара паслом браслаўскага падкаморыча Мікалая Рудаміну[29]. Як гаварылася раней, Радзівіл падтрымаў са шматлікіх кандыдатаў шакінаўскага старосту Юзафа Струтыньскага, які і накіраваўся на соймік у Браславе[30]. Цікава, што адначасова Струтыньскі абяцаў дзейнічаць на гэтым сойміку ў інтарэсах "Фамілii"[31]. Магчыма такім чынам Струтыньскі спрабаваў прыбраць магчымыя перашкоды для свайго выбару. Браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна ад Радзівіла меў згоду, каб пасламі на сойм былі абраны яго сын браслаўскі падкаморыч Рудаміна і Юзаф Струтыньскі. Радзівіл нават пісьмова пажадаў Антонію Рудаміне паспяховага сканчэння браслаўскага пасольскага сойміка 1750 г.[32]

Вялікія намаганні ў паспяховым заканчэнні браслаўскага пасольскага сойміка 1750 г. прыклаў браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна. Менавіта з яго ліста становяцца вядомымі падрабязнасці гэтага сойміка. Ужо адразу ў пачатку сойміка супраць шакінаўскага старосты Юзафа Струтыньскага пратэставала шляхта, якая мела канфлікты аб мяжы з яго ўладаннямі ў Курляндыі і Інфлянтах. Ускладніла сітуацыю пратэстацыя супраць іншага канкурэнта на выбар паслом аршанскага падстаросты Аляксандра Ваўжэцкага. Толькі Мікалай Рудаміна не меў ніякіх пратэстаў супраць сябе. У выніку з-за усіх пратэстаў соймік быў сарваны яшчэ нават да выбару дырэктара сойміка[33]. Праўда, з'явілася інфармацыя, што пас-

[29] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 25, J. Strutyński do M. Łopacińskiego, 04.06.1750, Wilno, l. 54.

[30] AGAD, AR, dz. V, sygn. 7176, I. Kopiec do M.K. Radziwiłła, 18.06.1750, Wilno, k. 7. LMAB, f. 139, b. 2556, J. Łopaciński do J.S. Sapieha, 21.06.1750, Wilno, p. 28.

[31] Biblioteka Narodowa, sygn. 3285, cz.1, M. Czartoryski do M.A. Sapiehy, 06.03.1750, Wołczyn, k. 80v. T. Szwaciński, *Protekcja rosyjska udzielana przedstawicielom szlachty litewskiej u progu wojny siedmioletniej. Postawienie problemu*. „Kwartalnik Historyczny", rocznik CXVIII, 2011, z.1, s. 63.

[32] AGAD, AR, dz. V, sygn. 13425, A. Rudomina do M.K. Radziwiłła, 27.06.1750, Drujka, k. 72. AGAD, AR, dz. IV, sygn. 872, k. 419.

[33] AGAD, AR, dz. V, sygn. 13425, A. Rudomina do M.K. Radziwiłła, 27.06.1750, Drujka, k. 71–72. T. Szwaciński, *Strutyński Józef* [w:] Polski Słownik Biograficzny, t. XLIV, Warszawa–Kraków 2007, s. 482.

ламі ў Браславе былі абраны ўсе тры канкурэнты: Юзаф Струтыньскі, Мікалай Рудаміна і Аляксандр Ваўжэцкі[34]. Яшчэ ў некаторых крыніцах пасламі ўпаміналіся толькі вышэйзгаданыя Струтыньскі і Ваўжэцкі[35]. Аднак, больш верагоднай здаецца інфармацыя пра зрыў браслаўскага пасольскага сойміка 1750 г. Як можна меркаваць прычынай зрыву былі канкурэнцыі аб выбар паслом Юзафа Струтыньскага і Аляксандра Ваўжэцкага, якія прадстаўлялі групоўку Радзівілаў. Іншыя групоўкі не маглі пагадзіцца на выбар двух паслоў з групоўкі Радзівілаў.

Міхал Чартарыйскі быў засмучаны зрывам браслаўскага пасольскага сойміка. Аднак, лічыў складаным атрымаць каралеўскі ўніверсал на скліканне паўторнага сойміка, бо кароль такіх універсалаў выдаваць не хацеў, а да таго ж на паўторным сойміку былі б тыя перашкоды, якія прывялі да зрыву першага браслаўскага пасольскага сойміка[36]. Па гэтай ацэнцы бачна, што Чартарыйскі добра разумеў, што радзівілаўскія прыхільнікі Струтыньскі і Ваўжэцкі зноў будуць старацца аб выбар пасламі, а гэта не было і ў інтарэсе "Фамілії".

У гэты час сярод браслаўскай шляхты зноў з'яўляюцца ідэі правядзення выбараў на вольныя земскія ўрады. Антоній Рудаміна прасіў у ліпені 1750 г. віленскага ваяводу Міхала Казіміра Радзівіла склікаць браслаўскія элекцыйныя соймікі, каб сам мог стаць на ім браслаўскім маршалкам. Рудаміна інфармаваў, што ўжо амаль 26 гадоў займае ўрад браслаўскага падкаморыя і пасля

[34] Archiwum Narodowe w Krakowie, Archiwum Młynowski Chodkewiczów, sygn. 1282, k. 138.

[35] *Diariusze sejmowe z wieku XVIII*, t.3, Warszawa 1937, s. 28. Biblioteka Czartoryskich, sygn. 597, k. 691. Haus-, Hof- und Staatsarchiv, Wien, Polen, sygn. II 23, k. 216. Sächsische Hauptstaatsarchiv Dresden, loc. 3682/08, k. 368v.

[36] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 04.07.1750, Warszawa, p. 18. Biblioteka Czartoryskich, sygn. 592, k. 197. Biblioteka Czartoryskich, sygn. 966, k. 937. Archiwum Narodowe w Krakowie, Archiwum Młynowski Chodkewiczów, sygn. 1282, k. 255. Archiwum Państwowe w Gdańsku, sygn. 300, 29/219, k. 334. Archiwum Państwowe w Gdańsku, sygn.. 300 R/Ff 17, s. 7. AGAD, Archiwum Popielów, sygn. 119, k. 308v.

смерці браслаўскага маршалка Мірскага ў 1736 г. не мае ў павеце канкурэнтаў да гэтага ўрада. Універсал на скліканне элекцыйных соймікаў Рудаміна прасіў даслаць з "акенкам", але ўжо сам збіраўся ўпісаць туды даты элекцыйных соймікаў: на маршалкоўства – 9 снежня, на харужага – 10 снежня, на земскага суддзю – 11 снежня, на падсудка – 12 снежня[37]. Справа зацягнулася і ўжо ў студзені 1751 г. Рудаміна даслаў спіс браслаўскіх элекцыйных урадаў і пасля каго на іх трэба было выдаць універсалы на скліканне элекцыйных соймікаў[38]. Браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна памёр у 1751 г.[39]. Зразумела, што гэта Рудаміна быў ініцыятарам планаў правядзення элекцыйных соймікаў, то пасля яго смерці такія спробы спыніліся.

Ня шмат вядома пра наступны браслаўскі грамнічны соймік 1751 г. Браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна прасіў падтрымкі ў выбары яго сына дэпутатам на гэтым браслаўскім грамнічным сойміку ў Міхала Казіміра Радзівіла. Для гэтага прасіў даслаць адпаведныя загады да шляхцічаў-вайскоўцаў, што размяшчаліся ў Браслаўскім павеце[40]. Такія ж просьбы Антоній Рудміна накіраваў да лідара "Фамілії" падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Яго просьба была падтрымана Чартарыйскім. У выніку ён прасіў Мікалая Тадэвуша Лапацінскага падтрымаць стараннi браслаўскага падкаморыя Рудаміны абраць дэпутатам на браслаўскім грамнічным сойміку 1751 г. яго сына. Хто стане яго калегай Чартарыйскі пакідаў на выбар Лапацінскаму, але ў канцы ліста канкрэтызаваў,

[37] AGAD, AR, dz.V, sygn.13425, A. Rudomina do M.K. Radziwiłła, 26.07.1750, Dukszty, k. 74–75.

[38] AGAD, AR, dz. V, sygn. 13425, A. Rudomina do M.K. Radziwiłła, 04.01.1751, Dukszty, k. 83.

[39] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T.1. Województwo wileńskie XIV–XVIII wiek*., Opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy współpracy U. Jemialianczyka i A. Macuka, Warszawa 2004, s. 560.

[40] AGAD, AR, dz. V, sygn. 13425, A. Rudomina do M.K. Radziwiłła, 04.01.1751, Dukszty, k. 78.

што лепей калі ім будзе Цыпрыян Мірскі[41]. Акрамя гэтай просьбы Чартарыйскага напісаў да Мікалая Тадэвуша Лапацінскага і сам браслаўскі падкаморы Антоній Рудаміна[42]. У выніку гэтыя старанні скончыліся нічым, бо браслаўскі грамнічны соймік 1751 г. быў сарваны[43]. Магчыма якраз яго выбар быў выкліканы тым, што дэпутатамі спрабавала стаць адразу два прыхільніка "Фамілii" Мікалай Рудаміна і Цыпрыян Мірскі. Безумоўна, што на гэта не маглі пагадзіцца прадстаўнікі іншых груповак Браслаўскага павету.

Ужо ў жніўні 1751 г. свой папярэдні план выбараў на грамнічных соймiках 1752 г. склалі Сапегі. Паводле Міхала Антонія Сапегі на выбар дэпутатам у Браславе было шмат кандыдатаў. Сярод іх – субоцкі староста Рудаміна ці Мірскі, браслаўскі канюшы Бутлер, аршанскі падстароста Ваўжэцкі, Пётр Мірскі і шляхціч Жаба. На думку Міхала Антонія Сапегі добрымі кандыдатамі былі б Рудаміна і "даўні слуга" Бутлер[44]. Ужо ў лістападзе 1751 г. з'явіліся несапраўдныя фантастычныя чуткі, што ад "Фамілii" старацца аб выбар дэпутатам на браслаўскім грамнічным сойміку будзе брэсцкі кашталян Станіслаў Бужыньскі[45]. Віленскі каад'ютар меў праект, каб дэпутатамі ў Браславе былі прапанаваны адразу тры кандыдаты. У такім выпадку з мсціслаўскім земскім сурагатарам Ігнатам Блажэем Лапацінскім мелі быць абраны Ваўжэцкі, Копец

[41] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 18, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 13.01.1751, Wołczyn, l. 212v–213.

[42] AGAD, Zbiór rękopisów z Biblioteki Przeździeckich, sygn.. B–42, A. Rudomina do M. Łopacińskiego, 29.10.1750, Dukszty, k. 167–168.

[43] *Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis*, pod red. Andrzeja Rachuby; oprac. Andrzej Rachuba i Przemysław P. Romaniuk przy współpr. Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki, Warszawa 2004, s. 229. Biblioteka Czartoryskich, sygn. 592, s. 299. AGAD, AR, dz. V, sygn. 2152, Jan Chrapowicki do M.K. Radziwiłła, 20.02.1751, Swołna, k. 7.

[44] LMAB, f. 139, b. 4063, M.A. Sapieha do J.S. Sapiehy, 21.08.1751, Dereczyn, p. 289. А. Мацук, *Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.)*, Мінск 2010, с. 344.

[45] AGAD, AR, dz. V, sygn. 10702, cz. 2, I. Ogiński do M.K. Radziwiłła, 04.11.1751, Mińsk, k. 100v.

ці Скажэўскі. Яну Дамініку Лапацінскаму не падабаўся такі праект, бо ў такім выпадку Міхал Казімір Радзівіл лёгка не дапусціў бы браслаўскіх дэпутатаў у лік трыбунальскіх суддзяў нарабіўшы пратэстацый супраць браслаўскага сойміка. У такім выпадку можна было стаць дэпутатам на сойміку Мікалаю Тадэвушу Лапцінскаму з Копцем (якога Ян Лапацінскі лічыў лепшым кандыдатам) ці з Скажэўскім. Тым больш, што радзівілаўскі прыхільнік Андрэй Абрамовіч ад імя вялікага гетмана ВКЛ заяўляў аб прыхільным стаўленні Радзівілаў, калі Ігнат Лапацінскі быў бы абраны дэпутатам з Браслава[46]. Аднак, у выніку Ігнат Лапацінскі перадумаў старацца аб выбар дэпутатам на Трыбунал ВКЛ.

У выніку дэпутатамі на браслаўскім грамнічным сойміку 1752 г. былі абраны аршанскі падстароста Аляксандр Ваўжэцкі і Пётр Мірскі[47]. Юзаф Станіслаў Сапега інфармаваў брата Міхала Антонія, што спецыяльна даслаў на браслаўскі грамнічны соймік 1752 г. свайго адміністратара і браслаўскага абознага Станіслава Клота, які і быў абраны дырэктарам гэтага сойміка. Пры выбары дэпутатаў нечакана адмовіўся ад канкурэнцыі Мікалай Рудаміна і прасіў мясцовую шляхту аб падтрымцы аб выбар паслом на сойм у гэтым жа годзе. Дэпутатам замест яго быў абраны Аляксандр Ваўжэцкі. Другім дэпутатам быў абраны Пётр Мірскі. Юзаф Станіслаў Сапега падазраваў, што хтосьці ўгаварыў Мікалая Рудаміну так зрабіць, бо раней той выказваў вялікую зацікаўленасць у выбары дэпутатам, а Аляксандр Ваўжэцкі наадварот не цікавіўся выбарам дэпутатам[48]. Праўда, у выніку віленскі каад'ютар выказаўшы здзіўленне такой зменай планаў браслаўскаму падкаморыю

[46] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 14, J. Łopaciński do I. Łopacińskiego, b.d., b.m., l. 31v–32.

[47] *Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis*, pod red. Andrzeja Rachuby; oprac. Andrzej Rachuba i Przemysław P. Romaniuk przy współpr. Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki, Warszawa 2004, s. 232.

[48] LMAB, f. 139, b. 4088, p. 36. LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 18.02.1752, l. 142.

Антонію Рудаміне абяцаў у далейшым прыхільнасць свайго рода Рудамінам[49]. У сваю чаргу Міхал Антоній Сапега лічыў, што нічога дрэннага не адбылося ў тым, што абраны іншыя дэпутаты на браслаўскім грамнічным сойміку, чым было дамоўлена. Спадзяваўся, што яны будуць прыхільнымі "Фамілii"[50]. У сваю чаргу навагрудскі ваявода Юрый Радзівіл прасіў Міхала Казіміра Радзівіла падтрымаць Ваўжэцкага, як даўняга радзівілаўскага прыхільніка, да якога-небудзь трыбунальскага ўрада[51]. На жаль, невядома да якой групоўкі належыў Петр Мірскі. Магчыма станоўчая ацэнка выбараў на браслаўскім сойміку Сапегамі тлумачыцца тым, што ён быў прыхільны "Фамілii". У такім выпадку, былі абраны дэпутаты: адзін з групоўкі Радзівілаў, а другі – з "Фамілii".

Яшчэ ў ліпені 1752 г. радзівілаўскі прыхільнік Станіслаў Лопат праз Цыпрыяна Мірскага прасіў Лапацінскіх аб падтрымцы ў выбары паслом на браслаўскім пасольскім сойміку 1752 г.[52] Аднак, Лапацінскі сам стаў кандыдатам "Фамілii" на выбар на браслаўскім сойміку. Міхал Чартарыйскі абяцаў напісаць да сваіх прыхільнікаў у Браслаўскім павеце аб падтрымцы выбара паслом Мікалая Тадэвуша Лапацінскага, калі той вырашыць канкураваць аб пасольства на мясцовым пасольскім сойміку[53]. Ян Дамінік Лапацінскі быў незадаволены, што Міхал Чартарыйскі не пагаджаўся на выбар паслом Мікалая Тадэвуша Лапацінскага на адным з эгзулянцкіх соймікаў. Больш таго, падканцлер ВКЛ вызначаў гэтыя соймікі для абрання сваіх "фаварытаў", а Лапацінскага адсылаў старацца аб выбар паслом на "каштоўныя і жвавыя соймікі" у

[49] LMAB, f. 139, b. 4088, p. 38.

[50] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 24, M.A. Sapieha do M. Łopacińskiego, 25.02.1752, Słonim, l. 85.

[51] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 221, J. Radziwiłł do M.K. Radziwiłła, 16.02.1752, Słuck, k. 17–18.

[52] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 08.07.1752, Wilno, l. 100–100v.

[53] LVIA. F. 1135, op. 14, b. 18, M. Czartoryski do M. Łopacinskiego, 21.07.1752, Wołczyn, l. 221.

Браславе і Полацку[54]. Аднак, погляды лідара "Фамілії" памяняліся. 18 ліпеня 1752 г. Міхал Чартарыйскі напісаў Мікалаю Тадэвушу Лапацінскаму, што атрымаў інфармацыю ад сваіх прыхільнікаў, што на выбар паслом на браслаўскім пасольскім сойміку 1752 г. будуць прэтэндаваць субоцкі староста Мікалай Рудаміна, браслаўскі мечнік Цыпрыян Мірскі і шакінаўскі староста Юзаф Струтыньскі. У такім выпадку, Чартарыйскі бачыў, што выбар у Браславе Лапацінскага магчымы толькі з большай "рызыкай і складанасцямі" і таму пакідаў канчатковае рашэнне ехаць ці не на мясцовы соймік самому Мікалаю Тадэвушу Лапацінскаму. Адначасова лічыў сумніўным яго выбар на старадубскім сойміку, але магчымым на смаленскім. Таму прасіў Лапацінскага вызначыцца з павятовым соймікам, дзе той будзе старацца аб выбар паслом на сойм 1752 г.[55]. Напэўна Чартарыйскі не атрымаў адказу і паўтарыў сваё пытанне ў іншым лісце ад 16 жніўня 1752 г.[56]

У гэты час змяніў думку Ян Дамінік Лапацінскі, які лічыў, што яго брат Мікалай Тадэвуш без праблем можа быць абраны паслом на браслаўскім пасольскім сойміку 1752 г. У той час ён думаў, што ў выпадку эгзулянцкіх соймiках існаваў сумнеў, што справа скончыцца паспехам з-за вялікай лічбы канкурэнтаў на выбар пасламі[57]. Самі Лапацінскія працягвалі старацца аб выбар Мікалая Тадэвуша Лапацінскага як на старадубскім, так і на браслаўскім соймiках[58]. Пасля Ян Дамінік Лапацінскі ўдакладняў, што выбар Мікалая Тадэвуша Лапацінскага паслом у Браславе будзе магчымы, калі саступіць

[54] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 08.07.1752, Wilno, l. 100.

[55] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 18.07.1752, Wołczyn, p. 41–42. А. Мацук, *Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.)*, Мінск 2010, с. 354–355.

[56] LMAB, f. 119, b. 141, M. Czartoryski do M. Łopacińskiego, 16.08.1752, Wołczyn, p. 44.

[57] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 06.08.1752, b.m., l. 107–107v.

[58] LMAB, f. 139, b. 2556, J. Łopaciński do M.A. Sapiehy, 08.08.1752, Antokol, p. 35–36.

яму браслаўскі гродскі пісар Стэфан Беліковіч, а шакінаўскі староста Юзаф Струтыньскі замест браслаўскага сойміка будзе старацца паслом на інфлянцкім сойміку. У такім выпадку браслаўскі соймік будзе больш усяго верагодным месцам для выбару Лапацінскага паслом[59]. Са складанасцямі ўдалося прыбраць супраціў Мікалаю Тадэвушу Лапацінскаму з боку Аляксандра Ваўжэцкага, які падтрымліваў кандыдатуру на выбар паслом Юзафа Струтыньскага. У выніку Ваўжэцкі абяцаў падтрымаць выбар паслом у Браславе Мікалая Тадэвуша Лапацінскага. Пры чым, са слоў Ваўжэцкага, Струтыньскі мог саступіць і старацца аб выбар паслом на інфлянцкім сойміку. Да таго ж Лапацінскаму і Беліковічу мог саступіць сваю канкурэнцыю субоцкі староста Мікалай Рудаміна[60].

У выніку, аднак, было вырашана, што Мікалай Тадэвуш Лапацінскі стане паслом на смаленскім сойміку. У сваю чаргу Міхал Чартарыйскі заклікаў старацца аб пасольства на сойміку ў Браславе Юзафа Струтыньскага. Таксама такія заклікі ў сваіх лістах змясцілі да Струтыньскага Канстанцін Людвік Плятэр і Мікалай Тадэвуш Лапацінскі з перакананнем падтрымкі яго выбара ў Браславе. Праўда, шакінаўскі староста працягваў апасацца зрыву браслаўскага пасольскага сойміка 1752 г. і таму прасіў Канстанціна Людвіка Плятэра не выбіраць у першы дзень паслоў на інфлянцкім сойміку ў Дынабургу, а, як было даўней, лімітаваць соймікавыя паседжанні без выбару паслоў на наступны дзень. Калі б браслаўскі соймік быў сарваны, то тады б Струтыньскі на наступны дзень меў быць на інфлянцкім сойміку і быць абраным там паслом[61]. Як бачым, на-

[59] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 10.08.1752, Wilno, l. 109–109v.

[60] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3, J. Łopaciński do M. Łopacińskiego, 15.08.1752, Antokol, l. 113–113v.

[61] LVIA, f. 1276, ap. 2, b. 107, J. Strutyński do K. Platera, 19.08.1752, Sołoki, l. 638–638a. Biblioteka Narodowa, sygn. 3285, cz. 1, M. Czartoryski do M.A. Sapiehy, 04.07.1752, Wołczyn, k. 19. T. Szwaciński, *Protekcja rosyjska udzielana przedstawicielom szlachty litewskiej u progu wojny siedmioletniej. Postawienie problemu*, „Kwartalnik Historyczny", rocznik CXVIII, 2011, z.1, s. 63.

ват Струтыньскі не быў упэўнены, што ўдасца перашкодзіць зрыву браслаўскага пасольскага сойміка 1752 г., таму шукаў дадатковыя магчымасці быць абраным паслом на сойм Рэчы Паспалітай.

Браслаўскі пасольскі соймік 1752 г. нечакана быў сарваны шляхтай-вайскоўцамі. Прычынай была значная колькасць канкурэнтаў на выбар пасламі: шакінаўскі староста Струтыньскі, субоцкі староста Рудаміна, браслаўскі гродскі пісар Беліковіч, браслаўскі падстароста Ваўжэцкі і "першы з фамілii Квінтаў" (Юрый ці Станіслаў Квінты). Менавіта Квінта з сваімі братамі і таварышамі харугвы крайчага ВКЛ Марціна Радзівіла і маніфеставалі супраць усіх пастаноў сойміка і прывялі да яго зрыва[62]. Памятаем, што раней усе шляхцічы-вайскоўцы дзейнічалі ў групоўцы вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводы Міхала Казіміра Радзівіла і таму хутчэй усяго гэты соймік быў сарваны па яго загаду. Магчыма прычынай было тое, што якраз кандыдаты з групоўкі Радзівілаў (у першую чаргу вышэйзгаданыя Квінты) мелі слабыя шанцы стаць пасламі на гэтым сойміку. Праўда, удалося правесці паўторны браслаўскі пасольскі соймік, дзе пасламі былі абраны шакінаўскі староста Юзаф Струтыньскі і браслаўскі гродскі пісар Стэфан Беліковіч[63]. Струтыньскі ў гэты час супрацоўнічаў з Радзівіламі, а Беліковіч быў прыхільнікам Агінскіх. Як бачым, не знайшлося месца сярод паслом прыхільнікам "Фамілii", што было даволі незвычайна, бо гэтая групоўка дамінавала ў ВКЛ.

---

[62] LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 32, l. 133v. Хоць у некаторых крыніцах пасламі на сойм называліся Юзаф Струтыньскі і Мікалай Рудаміна. – Sächsische Hauptstaatsarchiv Dresden, loc. 3682/06, b.p. Адначасова маюцца звесткі, што і першы з паўторных соймікаў таксама быў сарваны. – T. Szwaciński, *Strutyński Józef* [w:] Polski Słownik Biograficzny, t. XLIV, Warszawa–Kraków 2007, s. 482.

[63] T. Szwaciński, *Strutyński Józef* [w:] Polski Słownik Biograficzny, t. XLIV, Warszawa–Kraków 2007, s. 482. *Diariusze sejmowe z wieku XVIII*, t. 3, Warszawa 1937, s. 131. W. Konopczyński, Sejm grodzieński 1752 roku, Lwów 1912. s. 106. Biblioteka Czartoryskich, sygn. 597, s. 745. Haus-, Hof- und Staatsarchiv, Wien, Polen, sygn. II 24, p. 122. Archiwum Państwowe w Gdańsku, sygn. 300, 29/219, k. 369. AGAD, Archiwum Popielów, sygn. 119, k. 321.

Перыяд 1750–1752 гг. быў вельмі кароткім, але важным у функцыянаванні соймікаў Браслаўскага павету. З трох грамнічных соймікаў паспяхова выбарам дэпутатаў завяршылася два: 1750 і 1752 гг. Абраныя дэпутаты прадстаўлялі ўплывовыя роды ў Браслаўскім павеце: Лапацінскія, Копці, Ваўжэцкія і Мірскія. З двух пасольскіх быў сарваны соймік 1750 г. Насамрэч быў сарваны і пасольскі соймік 1752 г., але поспехам скончыўся паўторны соймік. Абранне на ім паслом шакінаўскага старосты Юзафа Струтыньскага падкрэсліла яго значныя ўплывы сярод мясцовай шляхты. Выбар другім паслом Стэфана Беліковіча быў даволі нечаканай з'явай, якая засведчыла ўзрастанне ўплываў гэтага роду. У адрозненні ад усяго ВКЛ на браслаўскіх соймiках вельмі рэдка абіраліся прыхільнікі "Фамілii". Дакладней да іх можна аднесці толькі браслаўскага дэпутата Мікалая Тадэвуша Лапацінскага. Наадварот сярод абранных паслоў і дэпутатаў як мінімум палова была прыхільнікамі Радзівілаў, якія дамінавалі на браслаўскім соймiку. Смерць браслаўскага падкаморыя Антонія Рудаміны значна аслабіла пазіцыі гэтага роду. Сын памершага субоцкі староста Мікалай Рудаміна няўдала спрабаваў стаць дэпутатам на Трыбунал ВКЛ і паслом на сойм Рэчы Паспалітай. У абодвух выпадках, нават маючы падтрымку магнатаў, Мікалай Рудаміна меў саступіць больш моцным кандыдатам. У гэты час бачна ўзрастанне ўплываў рода Лапацінскіх у Браслаўскім павеце. Мікалай Тадэвуш Лапацінскі быў абраны дэпутатам у 1750 г., а ў 1752 г. быў рэальным кандыдатам на выбар паслом, але з пэўных меркаванняў сам адмовіўся. Мікалай Тадэвуш Лапацінскі актыўна ўдзельнічаў і ў соймiках іншых паветаў Княства, што абмяжоўвала яго непасрэдны ўдзел у браслаўскіх соймiках. На іх род Лапацінскіх пачынае прадстаўляць яго брат Ігнат Блажэй, які, якраз, у 1752 г. становіцца браслаўскім гродскім суддзёй. Моцнымі заставаліся і пазіцыі роду Ваўжэцкіх, якія ўмацаваліся на першых ролях сярод браслаўскай шляхты яшчэ ў 40-я гг. XVIII ст. Няўдачай скончыліся і планаваныя ў 1750–1751 гг. выбары ўраднікаў у Браслаўскім павеце. Гэ-

тыя соймікі маглі дапамагчы размеркаванню ўрадаў сярод вядучых шляхецкіх родаў і магчыма ў будучым памаглі б пазбегнуць тых канфліктаў, якія выбухнулі сярод браслаўскай шляхты ў далейшым. У перыяд 1736–1749 гг. з 14 дэпутацкіх і 6 пасольскіх было сарвана толькі 4 соймікі, а тут у перыяд з 1750–1752 гг. з 5 соймікаў было сарвана 2. Фактычна зрыў грамнічнага сойміка 1751 г., пасольскіх 1750 і 1752 гг. (адбыўся паўторны пасольскі соймік 1752 г.) сведчыць аб ўзрастанні супрацьстаяння ўнутры браслаўскай шляхты, бо нябачна, каб магнаты жадалі зрыву гэтых соймікаў. У будучыні ўсё гэта прывядзе да шматлікіх канфліктаў сярод мясцовай шляхты. У сувязі з гэтым можна назваць перыяд 1750–1752 гг. для браслаўскіх соймікаў часам страчаных магчымасцей.

Бібліяграфія

Archiwalia

Archiwum Główne Akt Dawnych (dalej: AGAD), Archiwum Radziwiłłów (dalej: AR), dz. IV, sygn. 221.

AGAD, AR, dz. IV, sygn. 872.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 2152.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 7176.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 10702, cz. 2.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 13425.

AGAD, Archiwum Popielów. sygn. 119.

AGAD, Zbiór rękopisów z Biblioteki Przeździeckich, sygn. B-42.

Archiwum Narodowe w Krakowie, Archiwum Młynowski Chodkewiczów, sygn. 1282.

Archiwum Państwowe w Gdańsku, sygn. 300, 29/219.

Archiwum Państwowe w Gdańsku, sygn. 300, R/Ff 17.

Biblioteka Czartoryskich, sygn. 592.

Biblioteka Czartoryskich, sygn. 597.

Biblioteka Czartoryskich, sygn. 966.

Biblioteka Narodowa, sygn. 3285, cz. 1.

Haus-, Hof- und Staatsarchiv, Wien, Polen, sygn. II 23.

Haus-, Hof- und Staatsarchiv, Wien, Polen, sygn. II 24.
Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių bibliotekos rankraščių skyrius (далей LMAB), f. 119, b. 9.
LMAB, f. 119, b. 141.
LMAB, f. 139, b. 2556.
LMAB, f. 139, b. 4063.
LMAB, f. 139, b. 4088.
Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей LVIA), f. 1135, ap. 14, b. 2.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 3.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 14.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 18.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 24.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 25.
LVIA, f. 1135, ap. 14, b. 32.
LVIA, f. 1276, ap. 2, b. 107.
L′vìvs′ka naukova bìblìoteka ìm. V. Stefanika NAN Ukraïni, f. 103, d. 4995 [Львівська наукова бібліотека ім. В. Стефаника НАН України, ф. 103, д. 4995].
Sächsische Hauptstaatsarchiv Dresden, loc. 3682/06.
Sächsische Hauptstaatsarchiv Dresden, loc. 3682/08.

Opracowania

Czeppe M., *Kamaryla pana z Dukli. Kształtowanie się obozu politycznego Jerzego Augusta Mniszcha 1750–1763*, Warszawa 1998.
Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis, pod red. A. Rachuby; oprac.: A. Rachuba i P. P. Romaniuk, przy współpr. A. Macuka i J. Aniszczenki, Warszawa 2004.
Diariusze sejmowe z wieku XVIII, t. 3, Warszawa 1937.
Dzieje rodziny Ciechanowieckich herbu Dąbrowa (XIV–XXI wiek), red. A. Rachuba, Warszawa 2013.
Hedemann O., *Historia powiatu brasławskiego*, Wilno 1930.
Macuk A., *Barac′ba magnackìh grupovak u VKL (1717–1763 gg.),* Mìnsk 2010 [Мацук А., *Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.)*, Мінск 2010].
Macuk A., *Barac′ba magnackìh grupovak za ŭrad padkanclera VKL u 1752 g.,* „Vescì NAN Belarusì. Ser. Ser. gumanìt. navuk", 2010, № 1, с. 57–64 [Мацук А., *Барацьба магнацкіх груповак за ўрад падканцлера ВКЛ у 1752 г.*, „Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук", 2010, № 1, с. 57–64].

Macuk A., *Braslaŭskìâ sojmìkì ŭ 50-h – pačatku 60-h gg. XVIII st.* [Мацук А., *Браслаўскія соймікі ў 50-х – пачатку 60-х гг. XVIII ст.*], „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2015, № 44, s. 62–98].

Macuk A., *Braslaŭskìâ sojmìkì ŭ drugoj palove 30–40 gg. XVIII st.,* „Arhìvaryus", 2018, vypusk 16, s. 226–239 [Мацук А., *Браслаўскія соймікі ў другой палове 30–40 гг. XVIII ст.*, „Архіварыус", 2018, выпуск 16, с. 226–239].

Macuk A., *Palìtyčnaâ sìtuacyâ vakol Trybunala VKL 1750 g.* [u:] *Priloženie k žurnalu "Vescì Nacyânal'naj akadèmìì navuk Belarusì". Molodëž' v nauke,* 2008, častʹ 2, s. 218–222 [Мацук А., *Палітычная сітуацыя вакол Трыбунала ВКЛ 1750 г.* [у:] *Приложение к журналу "Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". Молодёжь в науке,* 2008, часть 2, с. 218–222].

Macuk A., *Pìnskì sojmìk u trybunal'skaj kampanìì 1750 g.* [u:] Matèryâly navukova-praktyčnaj kanferèncyì "Gìstoryâ ì sučasnascʹ Pìnska (da 910-goddzâ peršaj letapìnaj uzgadki gorada, Minsk–Pinsk 2007, s. 77–93 [Мацук А., *Пінскі соймік у трыбунальскай кампаніі 1750 г.* [у:] *Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі "Гісторыя і сучаснасць Пінска (да 910-годдзя першай летапіснай узгадкі горада)",* Мінск–Пінск 2007, с. 77–93].

Macuk A., *Stronnictwo sapieżyńskie w powiatach Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Augusta III* [w:] *Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, Warszawa 2014, s. 287–318.

Palkij H., *Rudomina Dusiacki Antoni Ludwik* // Polski Słownik Biograficzny, t. XXXII, Wrocław–Warszawa–Kraków 1991, s. 668–670.

Rachuba A., *Miejsca obrad sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1569–1794* [у:] *Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддях*, Мінск 2008, с. 182–197.

Szwaciński T., *Protekcja rosyjska udzielana przedstawicielom szlachty litewskiej u progu wojny siedmioletniej. Postawienie problemu* „Kwartalnik Historyczny" rocznik CXVIII, 2011, z. 1, s. 47–83.

Szwaciński T., *Strutyński Józef* // Polski Słownik Biograficzny, t. XLIV, Warszawa–Kraków 2007, s. 481–484.

Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. 1: *Województwo wileńskie XIV-XVIII wiek*, opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy współpracy U. Jemialianczyka i A. Macuka, Warszawa 2004.

Zielińska Z., *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983.

The sejmik of Braslaw in the years 1750–1752

The Braslav gromnichny (deputy) sejmiks of 1750 and 1752 and the repeated embassy sejmik of 1752 ended by successful elections in 1750–1752. The deputies elected at that time represented influential families in the Braslav povet: the Lopatinskys, the Koptys, the Vavzhetskys and the Mirskys. The elected ambassadors in 1752 also belonged to the local elite: Jozef Strutyn`sky and Stefan Bielikovich. The election of Bielikovich as an ambassador was due to the support of his noble patrons, the Oginskys. In contrast to the entire the Grand Duchy of Lithuania, representatives of the noble group "Familia" were rarely elected at the Braslav sejmiks. On the contrary, at least half of the elected deputies and ambassadors at the Braslav sejmik at that time belonged to the Radzivils group. These three noble groups had the greatest influence on the Braslav sejmik at that time. From the Braslav sejmiks in 1750–1752 the gromnichy (deputy) sejmik of 1751 and the embassy sejmik of 1750 were disrupted. The embassy sejmik of 1752 was also disrupted, but the repeated one ended in success. Due to disagreement between the Braslav gentry, the elections of uryadniks (officers) in the Braslov district, which were planned for 1750–1751 ended in failure. The increase in the number of disrupted Braslav sejmiks during this period indicates an intensification of the struggle within the local gentry, since the nobility did not need to disrupt these sejmiks. This became a harbinger of the next period in the functioning of the Braslav sejmik, which took place in constant conflicts between the Braslav gentry.

Key words: povet (district), sejmik, Braslav, gentry, nobility